юць філасофскі змест і ствараюць гукавобраз сіняга туману. Хутчэй за ўсё, колеры вясны Алеся Разанава такія ж яркія, як на карціне Эйвінда Эрла – зялёны, жоўты, чырвоны. Успаміны, якія выклікаюць радасныя эмоцыі, могуць быць рознакаляровымі, шматфарбнымі. Аднак рэжысёр тут менавіта чытач, і яго асабістыя асацыяцыі дыктуюць усю колеравую гаму, акрамя аднаго – колеру сіняга туману.

Такім чынам, эстэтычная вартасць і мастацка-выяўленчага, і літаратурна-мастацкага вобраза “Сіняга туману” üдавочная: мастак – вобраз – глядач, паэт – вобраз – чытач – гэтыя два ланцужкі дазваляюць адчуць, убачыць іх метафарычнасць: лагічнае і рэальнае ў пейзажы Эйвінда Эрла, рэальнае і сімвалічнае ў версэце Алеся Разанава.

**Літаратура**


1. Балек, Ян. Синий – цвет жизни и смерти. Метафизика цвета. – М.: Искусство. – XXI век, 2008. – 408 с.
2. Балова, О. Л.Способы интерпретации текстов: экспликация глубинного смысла / О. Л. Балова // Яз.и культура. – 2013. – № 9. – С. 192–196.
3. Гаўрош, Н. В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 603 с.
4. Иттен Иоханнес. Искусство цвета / Перевод с немецкого; 2-е изд. – М.: Д. Аронов; 2001. – 96 с.
5. Кожина, Н. А. Заголовок художественного произведения: структура , функции, типология / Автореферат диссертации канд. филол. наук. – М, 1986.– 288 с.
6. Культуралогия. Энциклопедия. В 2-х т. Том 1 / гл. ред. и автор проекта С. Я. Левит. – М.: “Российская политическая энциклопедия” (РОССПЭН), 2007. – 1392 с.
7. Лукин, В. А. Художественный текст: основы лингвистической теории, аналитический минимум / В. А. Лукин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Ось-89, 2005. – 559 с.
8. Современный словарь по культурологии. – Мн.: “Современное слово”, 1999. – 736с.
9. Струц І. Я. Лінгвапаэтычны слоўнік колеравобразаў беларускай паэзіі першай трэці ХХ стагоддзя: у 3ч. / І. А. Струц. – Мінск: Юніпак, 2015. – Ч. 1: Колеравобраз прасторы. – 2015. – 240 с.



**A. Pisarenko**
The Belarusian State University of Culture and Arts
e-mail: kaffiloll@mail.ru


**Philological essay on the *blue mist* imagery in poetry and painting: comparative analysis of images in works by Ales Rasanau and Eyvind Earle**


*Key words: artistic image, imagery, magic realism, pictorial art, literary image, word picture, epithet, sound image, symbol.*



*This article compares and reveals the aesthetic value of the blue mist image on the example of Eyvind Earle’s painting and Ales Rasanau’sverset. The **blue and yellow** artistic antithesis shows the ambiguity of the artist’s feelings. As for the word imagery, it also contains the author’s antithesis – heart **mourns and rejoices**. While sharing the time of their creation (1980s) and the theme, the works of art in question depict light in different ways.*



**В.Ф. Падстаўленка**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: klit@vsu.by



УДК 821.161.3-1:7


## ПРАБЛЕМА ДРАМАТЫЧНЫХ СТАСУНКАЎ МАСТАКА І ЧАСУ Ў ПАЭТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ Т. КЛЯШТОРНАГА


*Ключавыя словы: лірычны герой, мастацтва, драматызм, ідэйна-тэматычная скіраванасць твора, крытычны пафас, падтэкставасць.*



*У артыкуле даследуюцца вытокі дысгарманічных стасункаў мастака і часу ў мастацкай сістэме Тодара Кляшторнага. Сцвярджаецца, што вершаваная творчасць Кляшторнага ўключала ў сябе і ўласна беларускія мастацкія канцэпты, і фрагментарныя праявы сусветнай класікі, і прыёмы авангарднай паэтыкі (элементы імажынісцкага мастацтва). Аднак, відавочна, што на гэты рознапачатковы творчы сінтэз негатыўны ўплыў аказалі грамадска-ідэалагічныя вектары ў мастацтве. Дэтэрмінізм мастацтва і жыцця, прызначэнне творчай асобы – гэтыя агульнаэстэтычныя аспекты заўжды былі ў цэнтры ўвагі Тодара Кляшторнага.*


Прызнаным з’яўляецца той факт, што беларуская паэзія першых двух дзесяцігоддзяў ХХ ст. развівалася ў рэчышчы ўласных нацыянальных традыцый і еўрапейскіх літаратурных уплываў эпохі мадэрнізму. Паказальным прыкладам таму можа паслужыць вершаваная творчасць Тодара Кляшторнага, патрыятычная аснова якой уключала ў сябе і ўласна беларускія мастацкія канцэпты, і фрагментарныя праявы сусветнай класікі, і прыёмы авангарднай паэтыкі (элементы




Репозиторий ВГУ

імажынісцкага мастацтва). Аднак, відавочна, што на гэты securityнапачатковы творчы сінтэз негатыўны ўплыў аказалі грамадска-ідэалагічныя вектары ў савецкім мастацтве.

*Пад небам вольнай Беларусі*
*Ісці ў далі сцежкай вохкай…*[1]

Гэтымі словамі аўтар, па сутнасці, прызнаў сваю творчую паразу, неактуальнасць асабістых мастацкіх поглядаў. Аднак згаданыя радкі, як і ўвесь верш “Ці варта сёння быць паэтам?”, маюць глыбокі падтэкст. Так, у вобразнай сістэме Кляшторнага *“ледзяныя гітары”* выступаюць як ўвасабленне лірыкі, што гаруе па згубленых, скаваных бездухоўнасцю ідэалах, перадусім ідэалах любові. Апелюючы да самога тэксту верша, варта дадаць, што лірычны герой пакідае *“ледзяныя гітары”* Бацькаўшчыне, увасобленай тут у сімвалічным для беларусаў вобразе бусла.

У прыведзеным вершы закранута і дадатковая тэма стасункаў паэта з агульнасветавай мастацкай спадчынай, “*старой культурай*”. Лірычны герой не спрабуе, як таго вымагалі стваральнікі сучаснага мастацтва, зменшыць вагу духоўных набыткаў папярэдніх эпох, ён толькі падкрэслівае неабходнасць сінтэзаваць усё, што назапашана чалавецтвам, з новым мастацтвам, каб прадэманстраваць прагрэсіўны стыль часу:

<…> сягоняшні паэта
Павінен даць і стыль эпохі.
Тады ён песню дасць такую,
Каб лес і горы захадзілі. [1]

Такім чынам, верш “Ці варта сёння быць паэтам?” з'яўляецца аўтарскім роздумам, творчай аўтарэфлексіяй над пытаннем пра сутнасць сучаснага мастацтва, калі “душа за песню галасуе”, а трэба “не пакідаць грамадскай варты, не пакідаць свае трыбуны” [1]. Частковая хаатычнасць высноў Кляшторнага і пэўныя хістанні яго аўтарскай пазіцыі дэтэрмінаваны немагчымасцю лёгка парушыць дагматызм тагачасных грамадскіх установак ці па-філасофску абстрагавацца ад іх.

**Літаратура**

1. Родныя вобразы / Літаратура / Тодар Кляшторны [электронны рэсурс] / Родныя вобразы. – Мінск, 2009. – Рэжым доступу: http://rv-blr.com/verse/show/41403. – Дата доступу: 10.01.2020.

**V.F. Podstavlenko**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: klit@vsu.by

**The problem of the dramatic relationship between the artist and time in the poetic system of T. Klyashtorny**

*Key words: lyrical hero, art, ideological and thematic focus of the work, critical pathos, subtext.*

*The article explores the origins of disharmonious relations between the artist and time in Todor Klyashtorny's artistic system. It is stated that Klyashtorny's poetic work included Belarusian artistic concepts, fragmentary manifestations of world classics, and techniques of avant-garde poetics (elements of imagist art). However, it is obvious that this diverse creative synthesis was negatively influenced by social and ideological vectors in art. The determinism of art and life, the purpose of the creative person-these General aesthetic aspects have always been the focus of Todor Klyashtorny's attention.*

**М.О. Польников**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: markpolnikov8@gmail.com

УДК 821.161.1-311.9+[791.42:82.091]

## ПОВЕСТЬ А. И Б. СТРУГАЦКИХ «ПИКНИК НА ОБОЧИНЕ» И ФИЛЬМ А.А. ТАРКОВСКОГО «СТАЛКЕР»: ОПЫТ ИНТЕРМЕДИАЛЬНОГО АНАЛИЗА

*Ключевые слова: интермедиальность, интермедиальный анализ, типы интермедиальности, литература, кинематограф.*

*В статье осуществляется краткий обзор явления интермедиальности и её типов, проводится интермедиальный анализ повести А. и Б. Стругацких «Пикник на обочине» и художественного фильма А.А. Тарковского «Сталкер» с помощью классификации типов интермедиальности, предложенной Н. Исагуловым.*

Интермедиальный анализ – перспективное, актуальное и развивающееся направление в современной семиотике и литературоведении. Активное исследование феномена интермедиальности осуществляли такие учёные как А. Ханзен-Лёве, С.П. Шера, И. Раевски, Н.А. Егорова, Н. Исагулов, Е.П. Шиньёв, Н.В. Тишунина, А. Тимашков, В.О. Чуканцова. Однако интерес к связям между произведениями различных видов искусства обнаруживается ещё в античную эпоху в «Поэтике» Ари-



Репозиторий ВГУ